Падтрымай "Вясну" на PATREON

Патрабаваў вярнуць вопратку – атрымаў штраф

07.09.2018 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Мікалай Салянік. Фота: "Гарадзенская Вясна".

Ленінскі раённы суд Гародні разгледзеў справу аб адміністратыўным правапарушэнні ў дачыненні да кіраўніка абласной арганізацыі АГП **Мікалая Саляніка**. Суддзя **Алена Пятрова** вынесла пастанову аб прыцягненні яго да адміністрацыйнай адказнасці па арт. 17.1. КоАП (дробнае хуліганства).

Мікалай Салянік так патлумачыў сітуацыю журналістам "Гарадзенскай Вясны":

> *– Як мяне затрымалі за спробу правесці флэшмоб у паласатай робе, мне стала кепска, і паколькі я інвалід другой групы, сардэчнік, мяне даставілі ў шпіталь. А там у мяне скралі маю паласатую робу, падрыхтаваную да флэшмоба. Я абурыўся і патрабаваў яе вярнуць, і казаў што там у мяне вялікая сума грошаў. Я ўпэўнены, што вопратку забрала міліцыя. Нібыта міліцыя па факту крадзяжу нават адчыніла справу. Але чамусьці ў Ленінскім раённым судзе сталі судзіць мяне за тое, што я як патрабаваў вярнуць мне мае рэчы нібыта мацюкаўся. Але я ўвогуле не мацюкаюся і тады не сказаў аніводнага нецэнзурнага слова. Тым не менш мяне аштрафавалі на 122,5 рублей. Гэта не проста ганебна, гэта ўжо гаворыць пра прыстойнасць усёй сістэмы.*

Нагадаем, што Мікалай Салянік ужо асуджаны за той выпадак, і яго абвінавацілі ў непадпарадкаванні міліцыі і правядзенні несанкцыянаванага мерапрыемстве ў інтэрнеце. Тады Суддзя Кастрычніцкага суда Гародні **Гергель Таццяна** не стала разглядаць фота і дідэаматэрыялы затрымання Мікалая Саляніка невядомымі людзьмі ў цывільным. Гэтыя фота і відэаматэрыялы хацелі прадставіць суду журналісты і сведкі таго інцыдэнта для ўстанаўлення ісціны. Але яны так і не былі разгледжаныя судом. Відэаматэрыялы ж міліцыі некуды прапалі. Не захаваліся да суда.
Суд у сваім рашэнні кіраваўся сведчаннямі міліцыянтаў. Сведкі з боку абвінавачваемага расказвалі зусім іншую гісторыю затрымання, чым міліцыянты. Аднак іх сведчанні, якія яны хацелі падмацаваць фота і відэаматэрыялямі, не аказалі ўплыву на судовае рашэнне.
Мікалая Саляніка, кіраўніка Гарадзенскай абласной арганізацыі АГП прызналі вінаватым у тым, што ён арганізаваў пікет у інтэрнеце і аказваў міліцыі непадпарадкаванне пры затрыманні ажно ў двух месцах гораду. У выніку яго аштрафавалі на 25 базавых велічынь.

Грамадска-палітычныя актывісты ў знак пратэсту супраць такога вядзення суда, які быў над Мікалаем Салянікам, выйшлі з залі.

Мікалая Саляніка разам з іншым актывістам АГП **Аляксандрам Лаўрэнцьевым** 3 ліпеня бягучага году гвалтоўна і брутальна затрымалі людзі ў цывільным каля дома, дзе жыве Лаўрэнцьеў. Актывісты хацелі ў паласатых турэмных робах зладзіць флэш-моб і паказаць як парушаюцца грамадзянскія канстытуцыйныя правы ў Беларусі.
Мікалай Салянік мае інваліднасць другой групы, у яго хворае сэрца. Неўзабаве пасля гвалтоўнага затрымання ён быў дастаўлены ў шпіталь. Праз дзень актывіст дакументальна зафіксаваў збіццё супрацоўнікамі сілавых структур. Пасля гэтага разгляд адміністрацыйнай справы быў адкладзены.

Тое рашэнне суда Мікалай Салянік ужо абскардзіў у Гарадзенскім абласным судзе. Разгляд справы адбудзецца 13-га верасня.

Новая судовая пастанова таксама будзе абскарджаная.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY